УДК 792.09:398

# АСАБЛІВАСЦІ РЭЖЫСУРЫ ФАЛЬКЛОРНЫХ ПРАДСТАЎЛЕННЯЎ У СЦЭНІЧНЫХ УМОВАХ

***Н. В. Петухова,*** *кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле раскрываецца спецыфіка рэжысуры фальклорных прадстаўленняў у сцэнічных умовах. Асаблівая ўвага надаецца арганізацыі дакументальнага і мастацкага матэрыялаў па законах тэатра і захаванню традыцыйнай практыкі трансляцыі фальклорных твораў. Звернута ўвага на знаходкі, рэжысёрскія прыёмы і сродкі мастацкай выразнасці, якія выкарыстоўваюцца для трансляцыі розных старонак з народнага жыцця і фрагментаў абраднасці.

**Ключавыя словы:** рэжысура, фальклорнае прадстаўленне, тэатралізацыя, традыцыі.

# PECULIARITIES OF DIRECTING FOLKLORE PERFORMANCES IN STAGE CONDITIONS

***N. Petukhova,*** *Candidate of Pedagogical Sciences, Head of the Department of Directing of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article reveals the specifics of directing folklore performances in stage conditions. Particular attention is paid to the organization of documentary and artistic materials according to the laws of the theater and the preservation of the traditional practice of broadcasting folklore works. We are talking about the findings, directing techniques and means of artistic expression, which are used to show different pages of folk life and fragments of rituals.

**Keywords:** directing, folklore performance, theatricalization, traditions.

Арганізацыя фальклорных прадстаўленняў у сцэнічных умовах – адзін з найбольш эфектыўных і складаных спосабаў прапаганды народных традыцый. Складанасць яго заключаецца ў тым, што рэжысёрская кампазіцыя такога мерапрыемства патрабуе арганізацыі дакументальнага і мастацкага матэрыялаў па законах тэатра і, адначасова, захавання структуры, выразных сродкаў і форм сімвалічных паводзін, уласцівых традыцыйнай практыцы трансляцыі фальклорных твораў. Гэта патрабуе вялікай сумеснай працы рэжысёра, харэографа, хормайстара, арганізатара.

У фальклорных прадстаўленнях выкарыстоўваюцца народная музыка ў натуральным гучанні і сучаснай апрацоўцы, абрадавыя, танцавальныя і лірычныя песні, харэаграфічныя замалёўкі. З пэўным стаўленнем да падзей і герояў выступае мастацкае слова, якое ў спалучэнні з рухамі і мімікай апавядае пра падзеі, якія непасрэдна адбываюцца перад гледачом, і ўвасабляе камунікацыю паміж удзельнікамі дзеяння.

Трэба падкрэсліць, што для сцэны, якая стварае дыстанцыю паміж выканаўцамі і слухачамі, характэрна пераасэнсаванне абрадава-святочнай культуры. Так, рэжысёр, ствараючы фальклорнае прадстаўленне, абавязаны раскрыць на новым эстэтычным узроўні прыродную сутнасць традыцыі. Размова ідзе пра знаходкі, прыёмы і сродкі мастацкай выразнасці, якія выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з улікам успрыняцця сучаснага глядача. І тут недастаткова простага капіравання фальклорных форм. Натуральнае асяроддзе, у якім існуюць народныя традыцыі, і сама атмасфера сцэны – гэта розныя ўмовы. Таму фальклорны матэрыял, узноўлены на сцэне з этнаграфічнай дакладнасцю, не заўсёды ўспрымаецца гледачом як мастацкая дасканаласць. Больш таго, часта ў ім губляецца непасрэднасць фальклорнай камунікацыі. Для рэжысёра важна зразумець, што выкарыстанне фальклору ў прадстаўленні не можа быць такім, у якім выглядзе ён выступае ў быту.

Пры распрацоўцы сцэнарыя фальклорнага прадстаўлення неабходна ўлічваць, што яно ўключае ў сябе пэўныя, замацаваныя традыцыямі абрадавыя дзеянні, мастацкія матэрыялы (песні, танцы, выказванні). Але сучаснае жыццё адрозніваецца ад таго, у якім узніклі старадаўнія традыцыі. Таму прайграванне сцэнарнай асновы свята ў сцэнічных умовах у тым выглядзе, якім яно было сто і больш гадоў таму назад, прывядзе да парушэння балансу паміж змястоўнай, ідэйна-тэматычнай скіраванасцю фальклорнага дзеяння і адпаведнасцю. Для рэжысёра сцэнарый – гэта не проста паслядоўнасць святочных і абрадавых дзеянняў, але драматургічна распрацаваны план, у якім, безумоўна, абрадавае дзеянне пераўтвараецца ў тэатралізаванае.

Тэатралізаванае ўвасабленне фальклорнага прадстаўлення патрабуе складання адпаведнага сцэнарыю праграмы, якая здолее аб'яднаць усе творы агульным сюжэтам. Своеасаблівасць сюжэтнага ходу тут заключаецца ў тым, што ён абавязкова павінны быць вобразным і рухаць развіццё сюжэту, злучаць эпізоды сцэнарыя. Пры гэтым вялікае значэнне набывае строгая лагічнасць пабудовы тэмы, нарастанне дзеяння, закончанасць кожнага асобнага эпізоду і раскрыццё зместу гульнёвых, карагодных, танцавальных і іншых народных песень пры дапамозе драматычных прыёмаў і сродкаў. Шырока выкарыстоўваюцца паказ розных старонак з народнага жыцця, фрагментаў абраднасці, а таксама падрыхтоўка адпаведных атрыбутаў народнага мастацтва і побыту (інструментаў, касцюмаў, прадметаў быту і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва). Вялікая ўвага надзяляецца выпрацоўцы навыкаў і ўменняў удзельнікаў адпаведна выконваць неабходныя рухі, выбудоўваць мізансцэны на працягу ўсяго выступлення.

Цяпер звернемся да аднаго з асноўных выразных сродкаў фальклорных прадстаўленняў – музыкі. Не адно народнае дзеянне не праходзіць без музычнага суправаджэння, з дапамогай якога рэжысёр стварае атмасферу, задае неабходны тэмпа-рытм і г. д. У адпаведна могуць удзельнічаць музычныя калектывы: народныя аркестры, фальклорныя ансамблі. Сур'ёзную ўвагу трэба надаваць запісу прыродных гукаў. Натуральныя шумы і гукі жывых істот неабходны для стварэння атмасферы ў эпізодах, малюючых прыроду. Бо з дапамогай нават самых цудоўных музычных мелодый не заўсёды ўдаецца стварыць у гледача належнае ўспрыманне прыроды.

У народным дзеянні музыка можа быць сюжэтнай і фонавай (ці, як кажуць у тэатры, «ствараць настрой»), яна можа выяўляць унутраны свет героя або быць кантраснай па стаўленні да дзеяння. Але апроч усяго, у прастаўленні яна можа дапамагаць гледачу ствараць асацыяцыі, з'яўляючыся сімвалам, знакам пэўнай падзеі. Мелодыя ці нават адзін радок дазваляюць растлумачыць гледачу, што адбылася змена эпох, і наступны эпізод развіваецца ў іншым часавым адрэзку [1, с. 176].

Не менш важнае значэнне ў фальклорных прадстаўленнях адыгрывае «мастацкае слова», якое апавядае пра падзеі мінулага, якія непасрэдна адбываюцца перад гледачом, раскрывае асабістае стаўленне да герояў [2, с. 235]. Варта падабраць вобразны і лаканічны матэрыял, які носіць дзейсны пачатак і абвастрае ўвагу гледачоў да камунікацыі.

Такім чынам, рэжысура фальклорных прадстаўленняў ва ўмовах сцэны – працэс складаны і працаёмкі. Ён патрабуе глыбокага ведання народных традыцый і абрадаў, разумення сімволікі паводзін і зместу рытуалаў. Пры распрацоўцы сцэнарыя неабходна захоўваць рысы, уласцівыя фальклорнаму мастацтву, і патрабаванні да сцэнічнага адпаведна.

1. *Гуд, П. А.* Тэхналогія стварэння свята [Электронный ресурс] : курс лекцый для спецыяльнасці «рэжысура» / П. А. Гуд. – Мінск : [б. в.], 2007. – 222 с. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/handle/123456789/13888;jsessionid=23B47F33FE3622803929566EB3E25AB7. – Дата доступу: 01.04.2023.

2. Режиссура театра и массового театрализованного действа : слов.-справ. / сост. Р. П. Козлова. – 5-е изд., испр. и доп. – Пермь : Книж. формат. – 2010. – 536 с